Весці БДПУ. Серыя 2. 2019. № 4. С.97–102

УДК 008:267.1

UDC 008:267.1

# РЫМА-КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ У БЕЛАРУСІ ЯК САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫ ІНСТЫТУТ ФАРМІРАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

# ROMAN-CATHOLIC CATHEDRAL IN BELARUS AS A SOCIAL-CULTURAL INSTITUTION OF FORMING AND DEVELOPING OF SPIRITUAL VALUES

**А. В. Усніч,**
*аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, РІВШ*

**A. Usnich,**
*Postgraduate Student of the Department of Historical-Cultural Heritage of Belarus, RIHS*

Паступіў у рэдакцыю 11.07.19.

Received on 11.07.19.

У артыкуле разглядаецца праблема сучаснага стану духоўнасці і маральнага выхавання беларускага грамадства, а таксама роля Рыма-каталіцкага Касцёла ў Беларусі ў фарміраванні і развіцці духоўных каштоўнасцей. Аналізуюцца формы рэалізацыі фарміравання каштоўнасных арыентацый асобы і грамадства праз шматлікія каталіцкія навучальныя ўстановы, рэлігійныя і сацыяльна-культурныя аб'яднанні і праекты, якія існуюць у лоне Каталіцкага Касцёла ў Беларусі і спрыяюць пашырэнню аксіясферы асобы і грамадства ў цэлым.

*Ключавыя словы:* Рыма-каталіцкі Касцёл, рыма-каталіцкая канфесія, духоўныя каштоўнасці, навучальныя ўстановы, рэлігійныя аб'яднанні, супольнасць сем'яў, хрысціянская адукацыя і выхаванне, хрысціянскія і маральныя прынцыпы.

The article deals with the problem of the current state of spirituality and moral education of the Belarusian society, as well as the role of the Roman Catholic Church in Belarus in the formation and development of spiritual values. The forms of realization of formation of value orientations of the individual and society through numerous Catholic educational institutions, religious and socio-cultural associations and projects existing in the bosom of the Catholic Church in Belarus and contributing to the expansion of the axiosphere of the individual and society as a whole are analyzed.

*Keywords:* Roman Catholic Church, Roman Catholic denomination, spiritual values, educational institutions, religious organizations, family community, Christian education and upbringing, Christian and moral principles.

*Уводзіны.* Тэма духоўных каштоўнасцей для беларускага народа заўсёды мела актуальнасць. Культурныя каштоўнасці, духоўная спадчына на працягу шматлікіх стагоддзяў былі крыніцай нацыянальнай духоўнасці. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, якія былі на працягу доўгага часу (маецца на ўвазе час рэлігійнага прыгнёту на беларускіх землях у XIX–XX стст. – *А. У.*), беларускаму народу ўдалося захаваць свае гісторыка-культурныя каштоўнасці і самабытныя традыцыі [1, с. 14].

Нацыянальнай акадэміяй навук штогод праводзіцца шэраг канферэнцый, прысвечаных праблеме духоўна-маральнага выхавання. Сучасныя даследчыкі І. В. Катляроў [1], І. В. Лашук [2], Н. Л. Баліч [3], Л. Е. Землякоў [4], Ю. У. Нікуліна [5] занепакоены станам духоўнасці ў грамадстве і тымі каштоўнаснымі арыенцірамі, якімі кіруецца маладое пакаленне ў XXI ст.

*Асноўная частка.* У жыцці сучаснага беларускага грамадства асаблівае месца займаюць Касцёл і Царква, якія прызваны дапамагчы людзям пашырыць аксіясферу і ўсвядоміць іерархію найбольш значных каштоўнасцей, на падставе якіх можна будзе пабудаваць духоўна моцнае грамадства.

Духоўна-этычны крызіс грамадства звязаны з распаўсюджваннем масавай культуры, якая залежыць ад камерцыялізацыі і забаўляльнай індустрыі, а таксама падмяняе духоўна-культурную спадчыну на псеўдакультурную. У рэаліях сучаснага жыцця, кіруючыся канцэпцыяй секулярызму, традыцыйная сістэма духоўных каштоўнасцей замяняецца

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

новымі каштоўнаснымі арыенцірамі, у выніку чаго шмат людзей трапляе ў стан духоўна-этычнай няўстойлівасці. Такая тэндэнцыя свету разбуральна ўздзейнічае на душу чалавека і на гарманізацыю адносін у грамадстве [4, с.18].

Плён секулярызацыі адчуваецца і ў рэлігійным жыцці вернікаў, якія, будучы ў лоне пэўнай канфесіі, успрымаюць часцей за ўсё толькі абрадны і рытуальны бок веры. Феномен «рытуалістаў» веры ўзнік з-за нізкай рэлігійнай адукацыі ў грамадстве і таму пагражае ўплывам на свядомасць людзей новых гібрыдна-рэлігійных з'яў, якіх з кожным днём узнікае ўсё больш і распаўсюджваецца ў XXI стагоддзі, носячы антысацыяльны характар [5, с. 25].

Асноўным асяроддзем для трансляцыі рэлігійнага вопыту і фарміравання духоўных каштоўнасцей была і застаецца сям'я. На жаль, традыцыйная сям'я сёння траціць свой аўтарытэт. Крызіс сям'і абумоўлены, у першую чаргу, не матэрыяльным становішчам і сацыяльнымі перашкодамі, а крызісам духоўнасці.

Каталіцкі Касцёл заўсёды быў і застаецца барацьбітам, які змагаецца за захаванне і ўмацаванне іствтута традыцыйнай сям'і. У лоне Рыма-каталіцкага Касцёла (далей – РКК) на Беларусі існуе шмат дзейсных праграм і праектаў, якія накіраваны на працу з сем'ямі:

- «Сужэнскія сустрэчы» – рух, які арганізоўвае рэкалекцыі для сужэнцаў (духоўныя практыкаванні). Мэтай іх з'яўляецца паглыбленне і аднаўленне сужэнскай еднасці і любові [6].
- Сямейны рух Equipes Notre-Dame (Супольнасць Маці Божай) – гэта беларускі сектар міжнароднага руху сужанскай духоўнасці, мэта якога – дапамога хрысціянскім сем'ям у перажыванні сакрамэнта шлюбу, падтрымка сем'ям ва ўзрастанні ў хрысціянскіх цнотах [7].
- Салезіянская суполка для сем'яў «ADMA Сям'я» (асацыяцыя сем'яў-шанавальнікаў Марыі Успамогі Хрысціянаў пад кіраўніцтвам манаскай супольнасці салезіянаў). Мэта ўдзельнікаў – наследаванне сямейнага стылю добразычлівасці, дзе галоўны акцэнт ставіцца на малітву сем'яў адно за аднаго, узаемадапамогу, магчымасць падзяліцца духоўным вопытам [8].
- Шматлікія рухі абароны каштоўнасці жыцця, якія ўключаюць не толькі духоўныя практыкаванні і малітву, але аказваюць дапамогу непасрэдна цяжарным і адзінокім маці, а таксама шматдзетным сем'ям. Дзейнасць гэтых рухаў заключаецца ў стварэнні і вядзенні дамоў адзінокіх маці, цэнтраў ахвяраў насілля ў сям'і, а таксама сямейных кансультацый, медыцынскіх кабінетаў і школ жыцця для сем'яў у крызісных сітуацыях [9].
- Апостальскі рух «Сям'я сем'яў» і іншыя рухі, прысвечаныя сям'і, апісанне якіх можна знайсці на старонках кнігі «Рухі і супольнасці. Маёвыя разважанні» [10].

Кожная з гэтых супольнасцей дапамагае сфарміраваць і развіць асноўныя хрысціянскія прынцыпы і каштоўнасці ў сем'ях (любоў да Бога і да бліжняга, праўду, свабоду, узаемадапамогу, справядлівасць, ахвярнасць і міласэрнасць), а таксама імкнецца пераканаць грамадства ў тым, што сям'я – гэта найважнейшая каштоўнасць дзяржавы і што яе таксама, як іншыя скарбы і каштоўнасці, неабходна захоўваць, аберагаць і клапаціцца пра яе дабрабыт.

На працягу трох гадоў РКК праводзіць сямейныя кангрэсы, дзе абмяркоўваюць праблемы і пытанні, з якімі сутыкаюцца сем'і, а таксама шукаюць выйсця з крызісных сітуацый. На кангрэсе збіраюцца прадстаўнікі ўсіх сямейных рухаў, якія існуюць у Беларусі [11].

Акрамя гэтых праграм праводзіцца праца па падрыхтоўцы моладзі да сужэнства і сямейнага жыцця. Маладым людзям падаецца не толькі лекцыйны матэрыял рэлігіяведаў, тэолагаў і духоўных асоб, але таксама адбываюцца сустрэчы з такімі спецыялістамі, як псіхолаг, псіхатэрапеўт, сэксолаг, гінеколаг і інш.

Такія заняткі, якія ўключаюць курс па планаванні сям'і, дапамагаюць маладым людзям сфарміраваць ці скарэкціраваць іерархію каштоўнасцей, а таксама маюць вялікую ролю ў абароне каштоўнасці жыцця ненароджаных дзяцей і тым змяншаюць пагрозу ўзрастання колькасці абортаў у Беларусі.

На жаль, не ўсе парафіяльныя касцёлы Беларусі могуць забяспечыць такую абшырную праграму падрыхтоўкі, але заўсёды ёсць магчымасць кожнаму жадаючаму папрысутнічаць на выязных лекцыях і занятках ці далучыцца да тых груп, якія дзейнічаюць у іншых абласных парафіях.

Для працы з сем'ямі спецыяльна рыхтуюцца кансультанты і дарадчыкі на курсах сямейнага жыцця пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі. Працягласць курса – тры гады. Месца навучання – цэнтр «Карытас» Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі і ў Гродна.

Для дзяцей і моладзі пры кожнай парафіі існуе «Нядзельная школа», дзе праводзяцца заняткі рэлігіі і ідзе падрыхтоўка да Першай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Камуніі (рус. Первое Причастие) і споведзі. Удзельнікі «Нядзельнай школы» падзелены па класах (групах), якія адпавядаюць узросту і классам агульнаадукацыйных школ, а таксама ёсць заняткі для дзяцей ад 3 да 6 год, для студэнцкай і працоўнай моладзі, для дарослых людзей, якія толькі пачынаюць вывучаць рэлігію, і для тых, хто хоча паглыбіць свае веды.

У парафіяльных касцёлах існуе шмат рэлігійных і духоўных аб'яднанняў, рухаў, гурткоў для дзяцей і моладзі, секцый па інтарэсах: вакал, парафіяльныя хоры, ансамблі, футбольныя гурты, заняткі на музычных інструментах, каталіцкія скаўты і інш. Такія аб'яднанні ставяць мэтай не толькі паглыбленне рэлігійных ведаў і эстэтычна-духоўнае развіццё маладога пакалення, але і пашырэнне культуры адносін, спрыяюць устанаўленню іерархіі каштоўнасцей, дзе на першым месцы духоўныя каштоўнасці, а не спаборніцтва ў матэрыяльнай і фізічнай перавазе.

Амаль што кожная парафія падчас летніх канікул ладзіць сумесны адпачынак для дзяцей пад назвай «Канікулы з Богам». Гэта добрая альтэрнатыва сучаснаму дзіцячаму лагеру, які не ўсе сем'і могуць сабе дазволіць з-за складанага матэрыяльнага становішча ці з-за «фобій» бацькоў, што аздараўленчы лагер можа адмоўным чынам паўплываць на выхаванне іх дзяцей і іншыя прычыны. Такія канікулы працягваюцца прыкладна тыдзень і, акрамя магчымасці паглыблення веры і новых знаёмстваў, маюць вельмі насычаную культурную праграму, якую кожная парафія арганізоўвае самастойна. У час такіх канікул дзеці і моладзь з задавальненнем удзельнічаюць у мерапрыемствах «Хвіліна славы», «Гала-канцэрт», спартыўныя спаборніцтвы «Мнагаборства», «Дзень танцаў і батутаў», экскурсійныя падарожжы па аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і інш. [12].

Такія малітоўна-інтэграцыйныя акцыі спрыяюць развіццю і пашырэнню аксіясферы жыццядзейнасці дзяцей і падлеткаў. Галоўны акцэнт ставіцца на сумесным адпачынку і сумеснай малітве. У дзяцей ёсць магчымасць трываць у малітве, спасцігаючы яе каштоўнасць, не саромеючыся і не баючыся, што іх аднагодкі высмеюць ці будуць іх цурацца. Псіхіка дзіцяці і падлеткаў не падрыхтавана да таго, каб стаць сучасным «мучанікам веры», і таму такія адпачынкі даюць магчымасць новаму пакаленню свабодна ад маральнага і псіхалагічнага прыгнёту вызнаваць хрысціянства.

Адной з дзейсных форм развіцця духоўных каштоўнасцей і далучэння моладзі да хрысціянскіх традыцый з'яўляецца паломніцтва (пілігрымка), якое ў апошні час актыўна развіваецца ў Беларусі і мае даволі шырокую аксіясферу [13, с. 55]. Любы паломніцкі рух – гэта своеасаблівая трансляцыя і перадача хрысціянскага вопыту старэйшага пакалення малодшаму, добрая магчымасць камунікацыі і рэлігійнай практыкі.

РКК на Беларусі і яго духавенства на працягу ўсёй сваёй гісторыі адыгрывалі важную ролю ў сферы адукацыі. Сёння існуюць, акрамя духоўных семінарый, навучальныя ўстановы для свецкіх асоб (з 18 год) – гэта Катэхетычны каледж імя Зыгмунта Лазінскага, дзе студэнты каледжа маюць магчымасць прайсці духоўную фармацыю, развіць свае таленты і атрымаць веды па тэалогіі, гісторыі Касцёла, біблістыцы, педагогіцы, філасофіі, псіхалогіі. Навучальная ўстанова прапануе тры спецыялізацыі – катэхетыка (для тых, хто жадае працаваць катэхетам), агульная тэалогія (без права выкладання) і сямейнае кансультаванне [14].

Другая навучальная ўстанова для свецкіх асоб – Мінскі тэалагічны каледж імя Яна Хрысціцеля. Студэнты каледжа атрымліваюць веды па тэалогіі (дагматычнай, маральнай, пастаральнай), Святым Пісанні, гісторыі Касцёла, кананічным праве, літургіі, патралогіі, рэлігіязнаўстве, сацыяльным вучэнні Касцёла, філасофіі, псіхалогіі, педагогіцы і іншых прадметах. Адметнасцю навучання ў каледжы ім. Я. Хрысціцеля ёсць тое, што студэнт выбірае на трэцім курсе кірунак, кваліфікацыйную группу. Група «А» – «агульная тэалогія» для асобаў, якія жадаюць паглыбіць сваю веру і веды. Група «B» – «тэалогія і катэхетыка» з правам працаваць у парафіях катэхетам. Група «C» – «тэалогія і касцёльны спеў» для тых, хто жадае працаваць у якасці кантара. Група «D» – «тэалогія і сродкі масавай камунікацыі» для будучых супрацоўнікаў каталіцкіх СМІ [15]. У наступным годзе плануецца адкрыць яшчэ адзін кірунак – «Рэлігійны турызм». Студэнты гэтай групы змогуць не толькі паглыбіць свае рэлігійныя веды, але набыць практычныя навыкі ў арганізацыі турыстычных маршрутаў і пілігрымак да святынь і сакральных месц як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі.

Яшчэ адна адукацыйная ўстанова для свецкіх асоб нядаўна з'явілася ў Гродна. Гродзенскі каталіцкі тэалагічны каледж прапаноўвае навучанне па двух кірунках: катэхетыка і агульная тэалогія [16].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Мэты тэалагічных і катэхетычных каледжаў падобныя – паглыбленне і пашырэнне рэлігійных ведаў, умацаванне веры, падрыхтоўка спецыялістаў для рэлігійнай дзейнасці, развіццё хрысціянскай культуры.

Такая фундаментальная адукацыя спрыяе пашырэнню ведаў і духоўнай аксіясферы не толькі ў беларусаў рыма-каталіцкага веравызнання, якія знаходзяцца ў лоне Касцёла, але ў сувязі з тым, што большасць сямей змешаны па канфесіянальнай прыналежнасці, станоўча ўплывае на светапогляды і захаванне сужэнства, дзяцей і моладзі з гэтых сем’яў.

Каталікі Беларусі маюць надзею, што ў хуткім часе ў Мінску з’явіцца свая вышэйшая адукацыйная ўстанова, дзе будуць рыхтаваць не толькі духавенства, але будзе магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю і свецкім вернікам. Канцэпцыя вышэйшай духоўнай навучальнай установы «Акадэмія імя святога Яна Паўла II» РКК у Беларусі ўжо распрацаваная [17].

Першай дзіцячай каталіцкай навучальнай установай на Беларусі стаў Хрысціянскі сацыяльны цэнтр «Добрага самараніна» пад апекай святой Уршулі Ледухоўскай, які пачаў сваю дзейнасць у мінулым годзе пад кіраўніцтвам сястры Чаславы Навіцкай USJK, якая была прызначана дырэктарам арганізацыі. Цэнтр займаецца выхаваннем і адукацыяй дзяцей, развіццём у іх хрысціянскіх каштоўнасцей, а таксама раскрыццём шматлікіх талентаў праз музычныя, харэаграфічныя, спартыўныя, экскурсійныя, рэлігійныя заняткі і інш., спрыяючы выхаванню новага пакалення актыўных грамадзян Беларусі [18].

Каталіцкі Касцёл і Праваслаўная Царква актыўна заахвочваюць напоўніць адукацыйны і выхаваўчы працэсы і ў дзяржаўных навучальных установах духоўнымі каштоўнасцямі, бо без іх не магчыма выканаць сваю галоўную функцыю – выхаваць носьбіта духоўных і культурных каштоўнасцей свайго народа, які ведае і паважае сваю гісторыю, веру і культуру [1, с. 17].

Канцэпцыя хрысціянскага выхавання базіруецца на разуменні таго, што чалавек – гэта асоба, якая мае каштоўнасць, індывідуальнасць, непаўторнасць і роўнасць перад Богам. Таму каталіцкая сістэма адукацыі накіравана на развіццё чалавека як асобы (яго інтэлектуальных, валітыўных магчымасцей, здольнасцей і талентаў). На падставе хрысціянскіх прынцыпаў маральнасці можна пабудаваць грамадства самасвядомых асоб, якое будзе здольнае вырашаць складаныя пытанні і праблемы, шануючы кожнага чалавека і ўсё, што датычыць культурнай і духоўнай спадчыны [19].

Недастаткова адзінкавых мерапрыемстваў і праектаў, накіраваных на развіццё аксіясферы маладога пакалення. Неабходна на дзяржаўным узроўні распрацаваць сістэматычныя заняткі і лекцыі для адукацыйных устаноў, а таксама выкарыстоўваць вопыт іншых краін, якія ў шэраг вучэбных прадметаў у агульнаадукацыйных сярэдніх школах уключаюць выкладанне такіх дысцыплін і лекцый, як этыка, рэлігіязнаўства, культуралогія, псіхалогія, прадметы эстэтычнага кірунку і інш. Неабходна здзяйсняць экскурсійныя падарожжы па месцах сакральнай геаграфіі Беларусі. Адукацыя, пабудаваная на хрысціянскіх прынцыпах і духоўных каштоўнасцях, – гэта вялікая скарбніца здаровага і напоўненага сэнсам жыцця як асобы, так і ўсяго грамадства.

*Заключэнне.* Такім чынам, РКК на Беларусі з’яўляецца не толькі рэлігійнай установай, але і сацыяльна-культурным інстытутам. Ён мае шэраг навучальных устаноў і вялікую колькасць рэлігійных і сацыяльна-культурных аб’яднанняў, здзяйсняе шматлікую колькасць праектаў, накіраваных на фарміраванне духоўных і культурных каштоўнасцей у грамадстве, але для дзейсных і якасных перамен неабходна сумесная і зладжаная праца дзяржавы і ўсіх хрысціянскіх канфесій.

*Літаратура*

1. *Котляров, И. В.* Традиционные ценности как основа развития белорусского общества: социологический анализ / И. В. Котляров // Духовно-нравственное воспитание на основе отечественных культурно-исторических и религиозных традиций и ценностей : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Жировичи, 27 мая 2010 г. / Нац. акад. наук Беларуси ; Ин-т философии, Белорус. Экзархат Моск. Патриархата Рус. Правосл. Церкви ; науч. ред. совет: М. В. Мясникович, Высокопреосвящ. Филарет [и др.]. – Минск : Бел. навука, 2010. – С. 13–18.

*References*

1. *Kotlyarov, I. V.* Tradicionnye cennosti kak osnova razvitiya belorusskogo obshchestva: sociologicheskij analiz / I. V. Kotlyarov // Duhovno-nravstvennoe vospitanie na osnove otechestvennyh kul'turno-istoricheskih i religioznyh tradicij i cennostej : materialy Mezhdunar. nauch.-prakt. konf., Zhirovichi, 27 maya 2010 g. / Nac. akad. nauk Belarusi ; In-t filosofii, Belorus. Ekzarhat Mosk. Patriarhata Rus. Pravosl. Cerkvi ; nauch. red. sovet: M. V. Myasnikovich, Vysokopreosvyashch. Filaret [i dr.]. – Minsk : Bel. navuka, 2010. – S. 13–18.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

2. *Лашук, И. В.* Структура ценностных ориентаций как показатель социокультурного кода белорусского общества / И. В. Лашук // Белорусское общество в контексте цивилизационно-культурного кода: социологическое измерение / редкол.: И. В. Котляров (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Бел. навука, 2017. – С. 130–139.
3. *Балич, Н. Л.* Христианские традиции – основа цивилизационно-культурного кода Беларуси / Н. Л. Балич // Белорусское общество в контексте цивилизационно-культурного кода: социологическое измерение / редкол.: И. В. Котляров (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Бел. навука, 2017. – С. 139–155.
4. *Земляков, Л. Е.* Традиционные духовно-нравственные ценности – важнейшая составляющая идеологии белорусского государства / Л. Е. Земляков // Духовно-нравственное воспитание на основе отечественных культурно-исторических и религиозных традиций и ценностей : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Жировичи, 27 мая 2010 г. / Нац. акад. наук Беларуси ; Ин-т философии, Белорус. Экзархат Моск. Патриархата Рус. Правосл. Церкви ; науч. ред. совет: М. В. Мясникович, Высокопреосвящ. Филарет [и др.]. – Минск : Бел. навука, 2010. – С. 18–20.
5. *Никулина, Ю. В.* Поддержание и развитие духовно-нравственных ориентиров белорусского общества: стратегии взаимодействия государства и Церкви / Ю. В. Никулина // Духовно-нравственное воспитание на основе отечественных культурно-исторических и религиозных традиций и ценностей : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Жировичи, 27 мая 2010 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т философии, Белорус. Экзархат Моск. Патриархата Рус. Правосл. Церкви ; науч. ред. совет: М. В. Мясникович, Высокопреосвящ. Филарет [и др.]. – Минск : Бел. навука, 2010. – С. 24–25.
6. Сям'я і яе каштоўнасці [Электронны рэсурс] // Культурна-рэлігійны часопіс «Дыялог». – Рэжым доступу: https://www.dialog1994.by/semya-i-obshhestvo/syam-ya-i-yae-kashtounastsi/. – Дата доступу: 15.09.2018.
7. Сямейны рух Equipes Notre-Dame [Электронны рэсурс] // Афіцыйны інтэрнэт-партал Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. – Рэжым доступу: https://catholic.by/3/news/belarus/7373-notre-dame. – Дата доступу: 16.09.2018.
8. Новая суполка для сем'яў ADMA Сям'я [Электронны рэсурс] // Афіцыйны інтэрнэт-партал Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. – Рэжым доступу: https://catholic.by/3/news/belarus/7112-pry-saleziyanskaj-parafii-minsku. – Дата доступу: 15.09.2018.
9. Рухі абароны жыцця [Электронны рэсурс] // Афіцыйны інтэрнэт-партал Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. – Рэжым доступу: https://catholic.by/3/kasciol/community/3939-rukhi-abarony-zhytstsya. – Дата доступу: 15.09. 2018.
10. Рухі і супольнасці. Маёвыя разважанні // Камісія па справах Божага культу і дысцыпліны сакрамэнтаў пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі. – Мінск : Pro Christo, 2006. – 264 с.
11. Агульнабеларускі кангрэс сямейных рухаў [Электронны рэсурс] // Каталіцкі партал Гродзенскай дыяцэзіі. – Рэжым доступу: https://grodnensis.by/anonsy/7222-agulnabelaruski-kangres-syamejnykh-rukha-projdze-baranavichakh.html. – Дата доступу: 15.09.2018.

2. *Lashuk, I. V.* Struktura cennostnyh orientacij kak pokazatel' sociokul'turnogo koda belorusskogo obshchestva / I. V. Lashuk // Belorusskoe obshchestvo v kontekste civilizacionno-kul'turnogo koda: sociologicheskoe izmerenie / redkol.: I. V. Kotlyarov (gl. red.) [i dr.]. – Minsk : Bel. navuka, 2017. – S. 130–139.
3. *Balich, N. L.* Hristianskie tradicii – osnova civilizacionno-kul'turnogo koda Belarusi / N. L. Balich // Belorusskoe obshchestvo v kontekste civilizacionno-kul'turnogo koda: sociologicheskoe izmerenie / redkol.: I. V. Kotlyarov (gl. red.) [i dr.]. – Minsk : Bel. navuka, 2017. – S. 139–155.
4. *Zemlyakov, L. E.* Tradicionnye duhovno-nravstvennye cennosti – vazhnejshaya sostavlyayushchaya ideologii belorusskogo gosudarstva / L. E. Zemlyakov // Duhovno-nravstvennoe vospitanie na osnove otechestvennyh kul'turno-istoricheskih i religioznyh tradicij i cennostej : materialy Mezhdunar. nauch.-prakt. konf., Zhirovichi, 27 maya 2010 g. / Nac. akad. nauk Belarusi ; In-t filosofii, Belorus. Ekzarhat Mosk. Patriarhata Rus. Pravosl. Cerkvi ; nauch. red. sovet: M. V. Myasnikovich, Vysokopreosvyashch. Filaret [i dr.]. – Minsk : Bel. navuka, 2010. – S. 18–20.
5. *Nikulina, Yu. V.* Podderzhanie i razvitie duhovno-nravstvennyh orientirov belorusskogo obshchestva: strategii vzaimodejstviya gosudarstva i Cerkvi / Yu. V. Nikulina // Duhovno-nravstvennoe vospitanie na osnove otechestvennyh kul'turno-istoricheskih i religioznyh tradicij i cennostej : materialy Mezhdunar. nauch.-prakt. konf., Zhirovichi, 27 maya 2010 g. / Nac. akad. nauk Belarusi, In-t filosofii, Belorus. Ekzarhat Mosk. Patriarhata Rus. Pravosl. Cerkvi ; nauch. red. sovet: M. V. Myasnikovich, Vysokopreosvyashch. Filaret [i dr.]. – Minsk : Bel. navuka, 2010. – S. 24–25.
6. Syam'ya i yae kashtoўnasci [Elektronny resurs] // Kul'turna-religijny chasopis «Dyyalog». – Rezhym dostupu: https://www.dialog1994.by/semya-i-obshhestvo/syam-ya-i-yae-kashtounastsi/. – Data dostupu: 15.09.2018.
7. Syamejny ruh Equipes Notre-Dame [Elektronny resurs] // Aficyjny internet-partal Katalickaga Kascyola ў Belarusi. – Rezhym dostupu: https://catholic.by/3/news/belarus/7373-notre-dame. – Data dostupu: 16.09.2018.
8. Novaya supolka dlya sem'yaў ADMA Syam'ya [Elektronny resurs] // Aficyjny internet-partal Katalickaga Kascyola ў Belarusi. – Rezhym dostupu: https://catholic.by/3/news/belarus/7112-pry-saleziyanskaj-parafii-minsku. – Data dostupu: 15.09.2018.
9. Ruhi abarony zhyccya [Elektronny resurs] // Aficyjny internet-partal Katalickaga Kascyola ў Belarusi. – Rezhym dostupu: https://catholic.by/3/kasciol/community/3939-rukhi-abarony-zhytstsya. – Data dostupu: 15.09. 2018.
10. Ruhi i supol'nasci. Mayovyya razvazhanni // Kamisiya pa spravah Bozhaga kul'tu i dyscypliny sakramentaў pry Kanferencyi Katalickih Biskupaў u Belarusi. – Minsk : Pro Christo, 2006. – 264 s.
11. Agul'nabelaruski kangres syamejnyh ruhaў [Elektronny resurs] // Katalicki partal Grodzenskaj dyyacezii. – Rezhym dostupu: https://grodnensis.by/anonsy/7222-agulnabelaruski-kangres-syamejnykh-rukha-projdze-baranavichakh.html. – Data dostupu: 15.09.2018.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Канікулы з Богам [Электронны рэсурс] // Catholicnews.by : Анлайн-версія газеты Віцебскай дыяцэзіі «Каталіцкі Веснік». – Рэжым доступу: http://catholicnews.by/tag/kanikuly-z-bogam/. – Дата доступу: 26.09.2019.
13. *Усніч, А. В.* Аксіясфера паломніцтва: сацыялагічны аспект (на падставе анкетавання паломнікаў) / А. В. Уснич // Социально-гуманитарные знания : материалы XV Респ. науч. конф. молодых учёных и аспирантов, Минск, 29 нояб. 2018 г. / редкол.: И. В. Титович (пред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2018. – С. 53–56.
14. Афіцыйны сайт Катэхетычнага каледжа ім. Зыгмунда Лазінскага [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://catcollege.by/. – Дата доступу: 12.03.2019.
15. Афіцыйны інтэрнэт-партал Каталіцкага Касцёла ў Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://catholic.by/3/news/announcements/8279-minski-tealagichny-kaledzh-imya-sv-yana-khrystsitselya-ab-ya-lyae-nabor-navuchentsa. – Дата доступу: 20.09.2018.
16. Навіны // Хрысціянскі інфармацыйны партал [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://krynica.info/be/2018/08/31/u-grodna-pachynae-navuchalny-god-kaledzh-tehalogii/. – Дата доступу: 26.06.2019.
17. Навіны анлайн-версіі газеты Віцебскай дыяцэзіі «Каталіцкі Веснік» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://catholicnews.by/biskup-jashje-ski-pradstavi-u-ryme-kancjepcyju-katalickaj-akadjemii-belarusi/. – Дата доступу: 26.06.2019
18. Рэлігійная арганізацыя «Дабрачынная Місія Добрага Самараніна пад апекай святой Уршулі Ледухоўскай» [Электронны рэсурс] // Афецыйны сайт хрысціянскага сацыяльнага цэнтра. – Рэжым доступу: https://samaranin.by/misija-Dobraha-Samaranina-u-Bielarusi/j-mission. – Дата доступу: 26.06.2019.
19. *Рылка, А.* Актуальнасць каталіцкай адукацыі [Электронны рэсурс] / А. Рылка // Афіцыйны інтэрнэт-партал Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. – Рэжым доступу: https://catholic.by/3/pub/auth/369-aktualnasts-katalitskaj-adukatsyi. – Дата доступу: 19.03.2019.

12. Kanikuly z Bogam [Elektronny resurs] // Catholicnews.by : Anlajn-versiya gazety Vicebskaj dyyacezii «Katalicki Vesnik». – Rezhym dostupu: http://catholicnews.by/tag/kanikuly-z-bogam/. – Data dostupu: 26.09.2019.
13. *Usnich, A. V.* Aksiyasfera palomnictva: sacyyalagichny aspekt (na padstave anketavannya palomnikaў) / A. V. Usnich // Social'no-gumanitarnye znaniya : materialy XV Resp. nauch. konf. molodyh uchyonyh i aspirantov, Minsk, 29 noyab. 2018 g. / redkol.: I. V. Titovich (pred.) [i dr.]. – Minsk : RIVSh, 2018. – S. 53–56.
14. Aficyjny sajt Katekhetychnaga kaledzha im. Zygmunda Lazinskaga [Elektronny resurs]. – Rezhym dostupu: http://catcollege.by/. – Data dostupu: 12.03.2019.
15. Aficyjny internet-partal Katalickaga Kascyola ў Belarusi [Elektronny resurs]. – Rezhym dostupu: https://catholic.by/3/news/announcements/8279-minski-tealagichny-kaledzh-imya-sv-yana-khrystsitselya-ab-ya-lyae-nabor-navuchentsa. – Data dostupu: 20.09.2018.
16. Naviny // Hrysciyanski infarmacyjny partal [Elektronny resurs]. – Rezhym dostupu: https://krynica.info/be/2018/-08/31/u-grodna-pachynae-navuchalny-god-kaledzh-tehalogii/. – Data dostupu: 26.06.2019.
17. Naviny anlajn-versii gazety Vicebskaj dyyacezii «Katalicki Vesnik» [Elektronny resurs]. – Rezhym dostupu: http://catholicnews.by/biskup-jashje-ski-pradstavi-u-ryme-kancjepcyju-katalickaj-akadjemii-belarusi/. – Data dostupu: 26.06.2019
18. Religijnaya arganizacyya «Dabrachynnaya Misiya Dobraga Samaranina pad apekaj svyatoj Urshuli Leduhoўskaj» [Elektronny resurs] // Afecyjny sajt hrysciyanskaga sacyyal'naga centra. – Rezhym dostupu: https://samaranin.by/misija-Dobraha-Samaranina-u-Bielarusi/j-mission. – Data dostupu: 26.06.2019.
19. *Rylka, A.* Aktual'nasc' katalickaj adukacyi [Elektronny resurs] / A. Rylka // Aficyjny internet-partal Katalickaga Kascyola ў Belarusi. – Rezhym dostupu: https://catholic.by/3/pub/auth/369-aktualnasts-katalitskaj-adukatsyi. – Data dostupu: 19.03.2019.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ